International Centre for Democratic Transition

# *Еўрапейская альтэрнатыва* *для Беларусі*

*Даклад Працоўнай групы па Беларусі Міжнароднага цэнтра за дэмакратычныя пераўтварэнні (ICDT)*

Еўрапейская альтэрнатыва для Беларусі

# ЕЎРАПЕЙСКАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА ДЛЯ БЕЛАРУСІ

ДАКЛАД ПРАЦОЎНАЙ ГРУПЫ ПА БЕЛАРУСІ
МІЖНАРОДНАГА ЦЭНТРА ЗА ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ
ПЕРАЎТВАРЭННІ (ICDT)

*Кастрычнік 2008 г.*

*Пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Нарвегіі, Цэнтра ўсходнееўрапейскіх даследаванняў (EESC), фонду "Foundation Amicus Europae" (FAE) і Нямецкага фонду Маршала Злучаных Штатаў Амерыкі.*

*Меркаванні, выказаныя ў гэтым дакладзе, належаць выключна асобным аўтарам, і могуць не супадаць з поглядамі спонсараў ці іншых арганізацый.*

Аўтарскія правы © 2008 Міжнародны цэнтр за дэмакратычныя пераўтварэнні (ICDT)
Усе правы абароненыя. Выкарыстанне і перадрук матэрыялаў, прадстаўленых ў гэтай брашуры, магчымыя толькі з пісьмовага дазволу аўтараў, за выключэннем выпадкаў змяшчэння кароткіх цытат у крытычных ці аглядных артыкулах. Па інфармацыю звяртайцеся ў Міжнародны цэнтр за дэмакратычныя пераўтварэнні (ICDT): 1022 Budapest, Árvácska utca 12.
Надрукавана ў Венгрыі

# ЗМЕСТ


## Уводзіны . . . . . . . . . . 5

Беларусь: вецер пераменаў? . . . . . . . . . . 6

Выбар паміж Усходам і Захадам – памылковая дылема . . . . . . . . . . 7

## Наша бачанне для беларусі . . . . . . . . . . 9

Магчымасці для дэмакратычных зменаў . . . . . . . . . . 9

Дыялог з Мінскам . . . . . . . . . . 10

Падтрымка дэмакратычнай апазіцыі . . . . . . . . . . 14

Падтрымка грамадзянскай супольнасці . . . . . . . . . . 18

Забеспячэнне Беларусі нецэнзураванай інфармацыяй . . . . . . . . . . 20

Паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека . . . . . . . . . . 21

Шырэйшае эканамічнае супрацоўніцтва . . . . . . . . . . 22

Разумная візавая палітыка . . . . . . . . . . 24

Трансатлантычнае супрацоўніцтва . . . . . . . . . . 25

## Рэкамендацыі . . . . . . . . . . 27

Дыялог з Мінскам з выкарыстаннем паступовага і абумоўленага падыходу . . . 27

Прызначэнне Адмысловага прадстаўніка ЕС па справах Беларусі . . . . . . . . . . 27

Падтрымка дэмакратычнай апазіцыі . . . . . . . . . . 27

Падтрымка грамадзянскай супольнасці . . . . . . . . . . 28

Забеспячэнне Беларусі нецэнзураванай інфармацыяй . . . . . . . . . . 28

Паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека . . . . . . . . . . 28

Заахвочванне эканамічнай уцягнутасці Захаду. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
Разумная візавая палітыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Удасканаленне трансатлантычнага супрацоўніцтва. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Аўтары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Старшыня Працоўнай групы па Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Члены Працоўнай групы па Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Іншыя аўтары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

# УВОДЗІНЫ

Беларусь – важная еўрапейская краіна, якая з 2004 года з'яўляецца суседкай Еўрапейскага Саюза. Яна мае шматлікія гістарычныя, эканамічныя і культурныя сувязі з народамі Еўрапейскага Саюза. Аднак адчуваецца, што Беларусь з сярэдзіны дзевяностых гадоў і пасля абрання Аляксандра Лукашэнкі Прэзідэнтам краіны не атрымала належнай увагі і адпаведнага месца, якіх яна безумоўна заслугоўвае, у парадку дня Еўрапейскага Саюза.

З прычыны ўнутрыдзяржаўных палітычных абставін Беларусь была выключаная з розных еўрапейскіх інстытутаў і міжнародных арганізацый і ператварылася ў ізаляваную краіну і ледзь не ў краіну-ізгоя. Беларусь зрабілася краінай, якую забыла Еўропа, дзяржавай, выключанай з паўсюднага спрыяльнага працэсу супрацоўніцтва ва ўсё больш і больш квітнеючай і інтэграванай Еўропе.

Тым не менш, з нядаўняга часу з боку беларускага ўрада і ўрадаў заходніх краін усё часцей выказваецца жаданне супрацоўнічаць. Напрыканцы 2007 года ў мэтах спрыянню гэтаму працэсу была ўтвораная Працоўная група па Беларусі, якая мусіла правесці ўсебаковы аналіз сітуацыі ў краіне і выпрацаваць канкрэтныя, дэталёвыя рэкамендацыі.

Старшынёй Працоўнай групы па Беларусі з'яўляецца былы Прэзідэнт Польшчы Аляксандр Квасьнеўскі (Aleksander Kwasniewski). У склад групы ўваходзяць вядомыя міжнародныя эксперты – прадстаўнікі вялікага шэрага еўрапейскіх краінаў. Большасць членаў гэтай групы складаюць былыя прэзідэнты альбо былыя міністры замежных спраў краін, прадстаўнікамі якіх яны з'яўляюцца. Пры дапамозе гэтага даклада Працоўная група па Беларусі спадзяецца прыцягнуць большую ўвагу кіраўнікоў шэрага еўрапейскіх краін і Злучаных Штатаў да сітуацыі ў Беларусі.

Незалежная, дэмакратычная і адкрытая Беларусь з'яўляецца агульным інтарэсам Еўропы, які падзяляе ўсё большая колькасць людзей у Беларусі, а таксама іншыя члены міжнароднай супольнасці. Каб дасягнуць гэтую мэту, мы мусім садзейнічаць дэмакратычным рэформам у краіне, а таксама умацоўваць еўрапейскі складнік беларускай самасвядомасці. Мы мусім даць Беларусі сапраўдную еўрапейскую альтэрнатыву.

## *Беларусь: вецер пераменаў?*

Шэраг мітынгаў ды іншых масавых мерапрыемстваў, якія адбыліся ў Беларусі, засведчылі, што ў насельніцтва, асабліва ў маладых, адукаваных людзей і гарадскіх жыхароў, расце прага да пераменаў у краіне. Дэмакратычных зменаў імкнецца дамагчыся не толькі вузкая палітычная апазіцыя, але і шырэйшая грамадзянская супольнасць.

Хаця беларуская апазіцыя наўрад ці павінна, альбо, насамрэч, наўрад ці можа выступіць адзіным фронтам па вырашэнні ўсіх праблем, непакоіць тое, што беларуская палітычная апазіцыя застаецца занадта раз'яднанай і не мае ніводнага лідэра, які б карыстаўся шырокай падтрымкай у грамадства. Адсутнічае сапраўдны дыялог, не кажучы ўжо пра супрацоўніцтва і каардынацыю дзеянняў паміж палітычнымі партыямі і грамадзянскай супольнасцю, вынікам чаго з'яўляецца адсутнасць у цяперашні момант выразнай праграмы еўрапейскага развіцця краіны, гэтаксама як няма і патэнцыялу кіравання. Гэтае пытанне асабліва патрабуе ўвагі ў сувязі з парламенцкімі выбарамі, якія адбыліся 28 верасня 2008 года. Рэжым Лукашэнкі працягвае аказваць моцны ціск на незалежныя СМІ, апазіцыйныя групы і незалежную грамадзянскую супольнасць. У краіне парушаюцца правы чалавека. Нягледзячы на тое, што ў цяперашні момант у краіне няма палітычных вязняў, прызнаных такімі на міжнародным узроўні, па-ранейшаму існуе судовы пераслед па палітычных матывах, не выключаецца магчымасць сур'ёзнага абвастрэння сітуацыі ў сувязі з выбарамі альбо пасля іх, у тым ліку і аднаўленне практыкі зняволенняў па палітычных матывах.

Пасля многіх гадоў амаль што завуаляванай эканамічнай падтрымкі, якую аказвала Расія ў выглядзе паставак энергарэсурсаў са значнымі льготамі, і пасля перамоваў аб утварэнні Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі, Расія зрабіла рашучы паварот у адносінах паміж дзвюма краінамі і радыкальна павялічыла экспартныя кошты на свае энергарэсурсы. У выніку энергетычныя рознагалоссі аказаліся для Беларусі пераломным момантам. Лукашэнка пачаў больш рашуча абараняць суверэнітэт Беларусі. Падаецца, што абарона суверэнітэту Беларусі з'яўляецца адзіным самым значным пытаннем, у якім пазіцыі Лукашэнкі, беларускай апазіцыі, а таксама Еўрапейскага Саюза і Злучаных Штатаў, супадаюць.

З аднаго боку, нягледзячы на рэзкія павелічэнні коштаў, расійскія пастаўкі энергарэсурсаў у Беларусь дагэтуль выконваюцца са значнымі льготамі, а ад павышэння коштаў экспарт усё ж такі дае ўплывовым элітным групам станоўчы канчатковы вынік. З другога боку, у краіны нават нашмат слабейшыя перспектывы, асабліва калі Расія працягне аказваць эканамічны ціск на Беларусь.

Мінск робіць выразныя спробы наладзіць адносіны з Еўрапейскім Саюзам, хаця б дзеля таго, каб ураўнаважыць сітуацыю. Саступкі прадугледжваюць

заключэнне пагаднення аб адкрыцці новага Прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі і вызваленне сусветна прызнаных палітычных вязняў. Можна заўважыць прыкметы пераарыентацыі і зняцця бар'ераў, хаця Лукашэнка па-ранейшаму моцна трымаецца за ўладу: ён здымае сваіх высокапастаўленых чыноўнікаў і прызначае на іх месца тых, хто цалкам залежыць ад яго ўлады. Паводле некаторых крыніц, маладое пакаленне экспертаў, якія знаходзяцца побач з Лукашэнкам, больш праеўрапейскія за яго, а гэта ў доўгатэрміновай перспектыве можна разглядаць як добры знак. Аднак на цяперашні момант улада, як і раней, належыць старой наменклатуры.

У гэтых акалічнасцях палітыка Еўрапейскага Саюза ў дачыненні да Беларусі па-ранейшаму з'яўляецца неэфектыўнай: надышоў час знайсці наватарскія шляхі, каб наладзіць адносіны з Беларуссю. З боку Бруселя таксама назіраюцца абнадзейлівыя зрухі, што робіць перагляд гэтай палітыкі Працоўнай групай яшчэ больш слушнай справай.

На стратэгічным узроўні для Беларусі павялічваецца магчымасць рэалізаваць сваё жаданне зблізіцца з Еўрапейскім Саюзам – гэта шанец, які Захад не мусіць прапусціць. У адрозненне ад нашай папярэдняй тактыкі мы мусім больш чула, глыбока і па-новаму засяродзіцца на тым, што́ Еўрапейскі Саюз можа прапанаваць Беларусі ў рамках актывізацыі супрацоўніцтва. Нам неабходна дасягнуць спалучэння праеўрапейскага штуршка, які сыходзіць з самой Беларусі, і жадання Еўропы наладзіць адносіны з Беларуссю.

Пры гэтым Еўрапейскі Саюз мусіць праводзіць грунтоўныя кансультацыі і супрацоўнічаць са Злучанымі Штатамі. Палітыка Еўрапейскага Саюза не павінна шкодзіць палітыцы Злучаных Штатаў, таксама як і палітыка Злучаных Штатаў мусіць улічваць і ў канчатковым выніку падтрымліваць палітыку наладжвання кантактаў Еўрапейскага Саюза. Такім чынам, мы падтрымліваем шырэйшае і глыбейшае супрацоўніцтва паміж Злучанымі Штатамі і дзеячамі, што праводзяць палітыку Еўрапейскага Саюза і актыўна ўдзельнічаюць у справах Беларусі.

## *Выбар паміж Усходам і Захадам – памылковая дылема*

Сёння Беларусь сутыкнулася з памылковай дылемай, якая складаецца з таго, што краіна нібыта мусіць выбіраць паміж расійскім эканамічным уплывам і эканамічнай уцягнутасцю Еўрапейскага Саюза. Дзякуючы энергетычнаму крызісу мінулых гадоў палітычная матывацыя эканамічнай ўцягнутасці Расіі стала відавочнай. Аднак еўрапейскія і заходнія інвестыцыі таксама не прыйдуць без палітычных умоў. Для таго каб прывабіць заходнія інвестыцыі, Беларусь

мусіць забяспечыць неабходны інвестыцыйны клімат, а гэта значыць удасканаліць прававое рэгуляванне, правесці лібералізацыю і прыватызацыю эканомікі. Усе гэтыя эканамічныя змены ў доўгатэрміновай перспектыве прывядуць да дэмакратызацыі.

Большасць краінаў з ліку гэтак званай Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (CEE – Central and Eastern European) кіравалася прынцыпамі лібералізацыі, дэмакратызацыі і еўраатлантычнай інтэграцыі, што сфармаваліся пасля 1989 года, аднак гэтае правіла не распаўсюдзілася на Беларусь, якая ўсё яшчэ трымаецца распаўсюджанай да 1989 года лініі паводзінаў халоднай вайны. Такім чынам, да сённяшняга дня большасць дзеянняў з боку Захаду у адносінах да Беларусі характарызаваліся хутчэй высакамерна-негатыўным стаўленнем, чым канструктыўна-пазітыўным. Беларускую апазіцыю часта крытыкуюць і лічаць яе слабай, раз'яднанай, пазбаўленай шырокай падтрымкі з боку грамадства. Аднак мы мусім усведамляць, што да 1989 года апазіцыя у шмат якіх пераходных, паспяховых на сённяшні дзень краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, знаходзілася не ў лепшай форме, чым апазіцыя сучаснай Беларусі. Моцнай і аб'яднанай апазіцыі вельмі складана развівацца, калі гэтага не дазваляюць акалічнасці.

Для працэсу пераўтварэнняў спатрэбяцца моцная апазіцыя і грамадзянская супольнасць, якія маглі б мабілізаваць шырэйшую падтрымку зменаў з боку грамадства, а пасля стаць каталізатарам больш еўрапейскай арыентацыі. Ключавое пытанне ў гэты момант заключаецца ў тым, як зацікавіць адміністрацыю Лукашэнкі ці хаця б "крытычную масу" з ліку службовых асоб і кіраўнікоў адміністрацыі, у арыентацыі на Захад і, у выніку, у забеспячэнні большай прасторы для дэмакратыі, неразрыўна з ёю звязанай. Досвед краінаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы паказвае, што гэткае зняцце бар'ераў можа адбыцца пры ўмове расколу ўнутры адміністрацыі, дзе прысутнічаюць прыхільнікі "мяккай лініі", якія паспяхова выступаюць за неабходнасць зменаў, і прыхільнікі "жорсткай лініі" (як правіла, блізкае асяроддзе, праваахоўна-судовы апарат і апарат бяспекі), якія разумеюць што ў іх няма іншага выбару, як пераўтварэнні. Мы цвёрда верым, што такая еўрапейская арыентацыя з'яўляецца адзінай доўгатэрміновай гарантыяй для суверэнітэту Беларусі. Застаецца толькі пытанне, як пераканаць у гэтым урад Лукашэнкі. Безумоўна, ізаляцыя і санкцыі для гэтага не найлепшы спосаб. Любы падыход мусіць суправаджацца палітыкай наладжвання кантактаў.

Наша бачанне для беларусі

# НАША БАЧАННЕ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

## *Магчымасці для дэмакратычных зменаў*

Хаця мы прызнаём, што цяперашняя адміністрацыя карыстаецца значнай унутранай падтрымкай, мы верым, што агульная сітуацыя патрабуе значных зменаў, і адначасова не можам не ўлічваць той факт, што пачуццё незадаволенасці гэтым кіраўніцтвам расце.

**Дэмакратыю нельга навязаць звонку**, і ніякія спробы зрабіць гэта не мелі даўгачасных, устойлівых станоўчых вынікаў. **Дэмакратыя можа сфармавацца толькі ў розумах людзей.** Знешні свет можа толькі дапамагчы ў забеспячэнні некаторых неабходных умоў, такіх як спыненне рэпрэсій, забеспячэнне законнасці, свабода слова і гэтак далей.

Беларуская палітычная апазіцыя ў цэлым слабая і вельмі раздробленая. Акрамя таго, хаця апазіцыйныя сілы маюць значную колькасць пасіўных прыхільнікаў, яны характарызуюцца вельмі слабай арганізаванасцю і ізаляванасцю ад шырокіх колаў грамадства. На цяперашнім этапе **апазіцыя выглядае няздольнай ажыццяўляць планамерныя змены і негатовай ўзяць на сябе кіраўніцтва працэсам пераўтварэнняў**.

Такім чынам, працэс мірных пераўтварэнняў можна ўявіць толькі ў выглядзе дыялогу з цяперашняй адміністрацыяй, які таксама прапаноўвалі асобныя групы беларускай апазіцыі амаль што год таму. Паралельна з гэтым неабходна забяспечыць гарантыю правоў апазіцыі. У гэтым працэсе **досвед краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы** можа быць вельмі карысным. Такім чынам, **не рэвалюцыя ў той ці іншай форме, а мірныя пераўтварэнні ў выніку перамоваў здаюцца больш рэалістычным варыянтам**.

**Мірныя пераўтварэнні на гэтым этапе патрабавалі б актыўнага ўдзелу хаця б невялікай часткі прадстаўнікоў цяперашняй эліты**, паколькі апазіцыя не мае ні прыдатнага кандыдата, ні ўлады для таго, каб іграць значную ролю у працэсе пераўтварэнняў, прынамсі, у бліжэйшай будучыні. Усё яшчэ патрабуецца з'яўленне палітычнага лідэра, які быў бы прымальным для абодвух бакоў, як гэта адбылося ў шмат якіх краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы падчас пераўтварэнняў. Гэты кампраміс мог бы быць першым крокам на шляху мірных пераўтварэнняў, які вядзе да цалкам дэмакратычных выбараў.

## *Дыялог з Мінскам*

Улічваючы тое, што адміністрацыя Лукашэнкі з’яўляецца адзіным “даступным” партнёрам для перамоваў, Працоўная група па Беларусі хацела б звярнуць увагу на некаторыя асаблівасці перамоваў з ёю.

Па-першае, на працягу сваёй доўгай кар’еры **Аляксандр Лукашэнка шмат разоў даказваў, што яго нельга недаацэньваць**. Гэта даволі прагматычны і хітры палітык. Нягледзячы на тое, што ў нашым успрыманні Лукашэнку нельга назваць “надзейным” партнёрам у перамовах, зразумець яго мэты і палітычныя задачы азначала б навучыцца прагназаваць яго крокі – канкрэтней кажучы, разам з яго ўласнымі інтарэсамі.

Адміністрацыя не з’яўляецца ні аднароднай, ні адзінай. Адзін Лукашэнка не здольны ўтрымаць сваю ўладу. Ён не можа абысціся без падтрымкі з боку эліты, якая знаходзіцца вакол яго. Гэтыя колы маюць пэўныя канкурыруючыя, у асноўным, эканамічныя, інтарэсы, і ўсе яны імкнуцца да ключавых пасадаў у кіраўніцтве самых прыбытковых прадпрыемстваў. У гэтых абставінах Лукашэнка мусіць пастаяннаператасоўваць і ўраўнаважваць гэтыя элітныя групы, а таксама падбухторваць іх адну супраць другой.

**Лукашэнка ніякім чынам не можа праявіць нават самую малую прыкмету слабасці**, бо гэта будзе пагрозай яго становішчу. Такім чынам, ён будзе станоўча рэагаваць толькі на тыя патрабаванні, якія не будуць вымагаць прызнання яго віны, альбо на тыя, якія дадуць яму магчымасць “захаваць твар”.

У гэтых умовах розныя часткі цяперашняй апазіцыі, прадстаўленай як палітычнымі партыямі, так і грамадзянскай супольнасцю, павінны стаць часткай гэтага працэсу. Рэальны прагрэс немагчымы без іх згоды і актыўнага ўдзелу ў суцэльным працэсе. У дадатак да гэтага, таксама шмат што трэба зрабіць дзеля ўтварэння пэўнага непалітычнага пласта беларускага грамадства, найбольш пажадана, з ліку прадпрымальнікаў і дзяржаўных службоўцаў сярэдняга звяна – “чыноўнікаў”.

## Паступовы і абумоўлены падыход

Прадугледжваецца, што з боку Прэзідэнта Лукашэнкі нельга чакаць ніякіх радыкальных зменаў. **На гэтым этапе ён здольны толькі на маленькія, паступовыя змены**, бо складанасць элітных груп, якія знаходзяцца побач з ім, дазваляе выкарыстоўваць толькі такую плаўную і асцярожную лінію паводзін. Павольныя дзеянні даюць яму час, неабходны для манеўравання сярод розных элітных груп.

Больш за тое, часткова з-за вышэйназваных прычын і часткова з-за яго асабістага светапогляду прагматычны шлях наладжвання адносінаў з беларускім урадам, на які Лукашэнка таксама быў бы здольны адрэагаваць, хутчэй з'яўляецца **падыходам, які цалкам заснаваны на адмоўнай абумоўленасці**. Трэба зазначыць, што такая абумоўленасць працуе і ў адваротным напрамку: не варта думаць, што любы крок у супрацьлеглым кірунку не выкліча адмоўнай рэакцыі з боку Еўрапейскага Саюза – альбо ў форме канкрэтных, актыўных дзеянняў, альбо ў форме нявыдачы абяцаных выгад. Еўрапейскі Саюз 13 кастрычніка прыпыніў на першыя паўгода забарону на ўезд для большасці беларускіх кіраўнікоў і гэтым зрабіў першыя крокі ў наладжванні адносін на аснове абумоўленасці: гэтае рашэнне прадугледжвае магчымасць аднаўлення абмежаванняў на ўезд у краіны Еўрапейскага Саюза ў любы момант, калі ўрад здзейсніць неналежныя, антыдэмакратычныя дзеянні.

Расія мае вялікі ўплыў на эканамічнае і культурнае жыццё Беларусі, таму ва ўзаемаадносінах паміж Еўрапейскім Саюзам і Беларуссю Расія, безумоўна, займае асаблівае месца. Група “Сяброў Беларусі ў час пераўтварэнняў” магла б стварыць агульную пляцоўку для дыскусіі, прысвечанай пошуку шляхоў вырашэння праблемаў, і для фармавання атмасферы даверу паміж урадамі.

## Быць рашучымі, але чулымі

Нядаўнія станоўчыя крокі з боку беларускага ўрада выклікалі ўражальны, прыхільны адказ Еўрапейскага Саюза. Сустрэча Міністра замежных спраў Беларусі Сяргея Мартынава з Міністрам замежных спраў Польшчы Радаславам Сікорскім (Radosław Sikorski) і, ў асаблівасці, запрашэнне Мартынава на паседжанне Еўрапейскай Камісіі не толькі паказалі гатоўнасць да зменаў з боку Еўрапейскага Саюза, але таксама атрымалі станоўчыя водгукі з боку Мінска.

Аднак выбары 28 верасня, па сутнасці, былі праведзеныя такім жа антыдэмакратычным чынам, як і папярэднія. Згодна са справаздачнымі дакументамі АБСЕ, **метады, якія выкарыстоўваў урад у прыхарошванні вынікаў выбараў, менш кідаліся ў вочы, аднак па-ранейшаму яўна не адпавядалі дэмакратычным стандартам**.

Можна аргументаваць, што моцная раздробленасць сярод апазіцыйных груп таксама спрыяла пройгрышу дэмакратычных кандыдатаў, бо яны, між іншым, насамрэч не атрымалі дастатковай колькасці галасоў, аднак **гэта не мяняе таго факта, што агульныя ўмовы выбараў былі зусім недэмакратычнымі**. Доступ да сродкаў масавай інфармацыі быў незбалансаваным, адсутнічала прастора для правядзення жывой перадвыбарчай кампаніі, прадстаўнікі дэмакратычнай

апазіцыі не дапускаліся да ўдзелу ў выбарчых камісіях, беларуская практыка датэрміновага галасавання паставіла пад сумнеў справядлівасць выбараў, і, што самае важнае, працэс падліку галасоў не быў празрыстым.

Разам з тым, нам бы хацелася перасцерагчы ад пераацэньвання важнасці апошніх парламенцкіх выбараў. **У канстытуцыйнай сістэме Беларусі парламент мае толькі вельмі абмежаваную ўладу.** Пакуль гэта не зменіцца, парламент захавае ўсяго толькі сімвалічнае значэнне, незалежна ад таго, ці будуць у ім прысутнічаць прадстаўнікі апазіцыі. Такім чынам, **не трэба занадта драматызаваць відавочна адмоўныя вынікі апошніх выбараў, паколькі дэмакратызацыя Беларусі залежыць не ад парламента, а ад волі Прэзідэнта і ад элітных груп вакол яго**.

Таму, нягледзячы на неапраўданыя чаканні, мы па-ранейшаму раім працягваць выкарыстоўваць прыхільны, больш актыўны падыход ЕС толькі з той адной прычыны, што **для адміністрацыі Лукашэнкі адзінай альтэрнатывай усё больш праеўрапейскай арыентацыі з'яўляецца Расія**. **Цяперашняе "прамежкавае" балансуючае становішча Мінска робіцца ўсё менш і менш устойлівым.** Таму Еўрапейскі Саюз і надалей павінен прапаноўваць прывабную альтэрнатыву, альбо прынамсі дэманстраваць гатоўнасць да гэтага.

Акрамя ўжо згаданага рашэння часова прыпыніць дзеянне забароны на ўезд у краіны Еўрапейскага Саюза, здаецца, што Еўрапейскі Саюз можа зрабіць і іншыя крокі дзеля далейшага наладжвання кантактаў з Беларуссю: 9 кастрычніка Еўрапейскі парламент не толькі падтрымаў рашэнне адносна забароны ўезду, але таксама прапанаваў знізіць кошт віз для звычайных грамадзян Беларусі.

Тым не менш, надзвычай важна захоўваць пільнасць. Неабходна памятаць пра тое, што ў Еўрапейскага Саюза нашмат большы час рэагавання, чым у беларускага ўрада, адзінства якога відавочнае, прынамсі, ў параўнанні з кіраўніцтвам Еўрапейскага Саюза. Іншымі словамі, антыдэмакратычнае абвастрэнне можа адбыцца нашмат хутчэй, чым Еўрапейскі Саюз зможа адрэагаваць. Абумоўленасць павінна адлюстроўвацца ў кожным кроку перамоўнага працэсу.

## Роля Украіны як пасярэдніка

**Украіна займае добрае палітычнае і геаграфічнае становішча для таго, каб выконваць ролю пасярэдніка ў перамовах паміж Еўрапейскім Саюзам і Беларуссю**. Паколькі яна не ўваходзіць ні ў Еўрапейскі Саюз, ні ў НАТА, Украіна больш падыходзіць на ролю "нейтральнага" пасярэдніка для Беларусі, чым любая краіна Еўрапейскага Саюза ці, у асаблівасці, НАТА. Украіна таксама магла б стаць адпаведным месцам сустрэч палітыкаў Еўрапейскага Саюза, Злучаных Штатаў і высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, якія пры гэтым не парушалі б забарону

на ўезд у краіны Еўрапейскага Саюза у тым выпадку, калі гэтая забарона была б аднаўленая. Аднак цяперашні палітычны крызіс ва Ўкраіне адмоўна ўплывае на яе палітычную здольнасць дзейнічаць у якасці пасярэдніка на міжнароднай палітычнай сцэне. Відавочна, што задавальняючае вырашэнне гэтага крызісу з'яўляецца неабходнай перадумовай для выканання падобнай ролі пасярэдніка.

## Адмысловы прадстаўнік Еўрапейскага Саюза па справах Беларусі

Еўрапейскі Саюз павінен удзяляць больш увагі Беларусі і пастаянна трымаць яе ў сваім палітычным парадку дня. Мы лічым, што прызначэнне Адмысловага прадстаўніка Еўрапейскага Саюза па справах Беларусі мае вялікае значэнне, асабліва калі адміністрацыя Лукашэнкі працягне рабіць станоўчыя крокі. Гэта не толькі паслужыла б сігналам павышанай і бесперапыннай цікавасці Еўрапейскага Саюза да Беларусі, але таксама стварыла б сталы канал для дыялогу паміж апазіцыяй і урадам. Адмысловы прадстаўнік Еўрапейскага Саюза па справах Беларусі таксама змог бы эфектыўней каардынаваць розныя ініцыятывы.

## Спіс неўязных асоб

Што тычыцца спіса неўязных асоб, досвед паказвае, што, нягледзячы на пачатковы скептыцызм, **гэты сродак атрымання саступак даказаў сваю эфектыўнасць** у перамовах з беларускім урадам. Нядаўняе рашэнне ЕС скараціць спіс неўязных асоб толькі да некалькіх асоб прыцягнула вялікую ўвагу і стала да беларускага ўрада вельмі ясным сігналам аб жаданні палепшыць адносіны.

Аднак да адміністрацыі Лукашэнкі трэба давесці, што **спіс неўязных носіць гнуткі характар – яго можна пашыраць альбо скарачаць**. Пры ўмове задавальняючага супрацоўніцтва існуе магчымасць выключыць з яго імёны некаторых асобаў, магчыма, нават некаторых высокапастаўленых. З другога боку, у выпадку працяглага невыканання ўмоў у спіс могуць быць уключаныя новыя імёны, а пры неабходнасці – нават сотні імёнаў.

## Больш канкрэтныя патрабаванні ЕС

Большасць экспертаў сыходзіцца ў меркаванні, што замест 12 агульных патрабаванняў, выказаных Еўрапейскім Саюзам у неафіцыйным, “рабочым” дакуменце, трэба падрыхтаваць больш кароткі і, самае важнае, больш канкрэтны спіс патрабаванняў, які павінен пастаянна ўдакладняцца. Карыснасць такога спіса магла б быць не толькі ў лягчэйшым яго разуменні як урадам, так і апазіцыяй, але таксама ў тым, што ён спрыяў бы далейшаму развіццю ідэі паступовага і абумоўленага падыходу.

Неабходнасць выпрацоўкі дэталёвага Плана развіцця адносінаў ЕС і Беларусі лагічна вынікае з неабходнасці выкарыстання падыходу абумоўленасці. Такі план развіцця патрабуе ўключэння падрабязнага спіса крокаў, выкананне якіх чакаецца ад адміністрацыі Лукашэнкі, і выгад ад ЕС за выкананне гэтых патрабаванняў; гэта павінна спрыяць акрэсленню прынцыпаў будучага, усё больш актыўнага наладжвання адносінаў.

План развіцця адносінаў ЕС і Беларусі неабходна выпрацаваць вельмі тэрмінова для таго, каб забяспечыць жыццяздольную, канкрэтную і пераканаўчую альтэрнатыву для Беларусі ў адказ на ўзмацненне ціску з боку Расіі. Акрамя Еўрапейскага Саюза і нацыянальных урадаў, да падрыхтоўкі плана развіцця трэба таксама залучыць групы экспертаў і прадстаўнікоў сектара няўрадавых арганізацый як з краін-членаў ЕС, так і з Беларусі.

## *Падтрымка дэмакратычнай апазіцыі*

Беларуская апазіцыя з’яўляецца маргіналізаванай з прычыны дзяржаўных рэпрэсій супраць апазіцыйных актывістаў, сістэматычнага руйнавання любых формаў апазіцыйнай структуры і каналаў інфармавання насельніцтва. Акрамя **знешніх рэпрэсій** развіццю моцнай апазіцыі перашкодзілі **ўнутраныя памылкі** і слабасць. Апазіцыя прыклала зашмат высілкаў, каб заручыцца падтрымкай сваіх прыхільнікаў у апазіцыйным асяроддзі і міжнароднай супольнасці, прытым **губляючы сувязь з насельніцтвам у цэлым**, паколькі вельмі мала намаганняў было зроблена дзеля эфектыўных зносінаў з народам. Відавочным і зразумелым з’яўляецца тое, што залежнасць большасці беларускіх апазіцыйных груп і партый ад замежных ахвяравальнікаў выклікала адчужэнне ад партый мясцовага насельніцтва. Больш за тое, гэта паскорыла ўнутраныя канфлікты і пагоршыла грамадскі імідж лідэраў партый і іх шараговых членаў.

Беларуская апазіцыя настолькі разлічвала на замежную дапамогу, што не паклапацілася пра стварэнне ўласных сіл, каб супрацьстаяць рэпрэсіям, замест гэтага яна занадта звязвала свае надзеі на падтрымку з-за мяжы. Хаця заходнія інстытуты і грамадзянская супольнасць іграюць важную ролю ў змякчэнні шкоды і абароне апазіцыйных актывістаў, яны не прадухіляюць (і не могуць прадухіліць) **маргіналізацыю апазіцыі**. Да пэўнай ступені замежная падтрымка проста дапамагла апазіцыі ўладкавацца ў той маргінальнай нішы, якую дазволіў ім заняць Лукашэнка.

## Заручыцца падтрымкай народу

Для ўмацавання беларускай апазіцыі, яе трэба актывізаваць да аднаўлення эфектыўных зносінаў з народнымі масамі па-за вузкімі апазіцыйнымі коламі. Як паказала апошняя выбарчая кампанія, тысячы грамадзян жадаюць паставіць подпіс за сваіх кандыдатаў. Палітычная база апазіцыі можа ўмацавацца і атрымаць развіццё пасля таго, як апазіцыя распачне працу над канкрэтнымі патрэбамі сваіх выбаршчыкаў і будзе прымаць непасрэдны ўдзел у шматлікіх эпізодах змагання грамадзян з дзяржаўнымі ўстановамі. Еўрапейскі Саюз мусіць дапамагчы апазіцыі развіць неабходныя здольнасці і спрыяць наладжванню кантактаў з новымі групамі грамадства. Дзеячы апазіцыі, якія надзвычай паспяхова праявяць сябе ў працы з насельніцтвам (згодна з вынікамі апытанняў), павінны ўзнагароджвацца.

## Сеткі замест кааліцыі

З моманту утварэння першай кааліцыі падчас прэзідэнцкіх выбараў у 2001 годзе палітычная разнастайнасць беларускай апазіцыі была адсунутая на задні план дзеля вырашэння надзвычай важнай праблемы дэмакратызацыі. З таго часу адрозненні паміж шмат якімі апазіцыйных партыямі у значнай ступені зводзяцца да пытанняў стылю (жыцця) і гісторыі партый. Замест таго, каб "змушаць" апазіцыю да ўнутраных спрэчак за лідэрства ў штучных кааліцыях і блакіраваць некаторым незалежным дзеячам доступ да кааліцыі, як гэта часам рабілі ахвяравальнікі ў мінулым, ЕС (і ЗША) мусяць спрыяць супрацоўніцтву розных груп ды фармаванню з іх адзінай сеткі. За кошт гэтага "апазіцыйны блок" таксама павінен стаць адкрытым для новых прыхільнікаў у шырэйшай беларускай супольнасці.

## Умацаванне самаабароны

Знаходзячыся пад ціскам, апазіцыя і незалежныя групы не застаюцца бездапаможнымі супраць дзяржаўных рэпрэсій. У шматлікіх выпадках беларускія праваабаронцы могуць фармаваць рычагі ўплыву, паколькі a) беларускія дзяржаўныя ўстановы не ўтвараюць адзіны блок – у іх пануюць унутраныя групоўкі і змаганне за ўладу, што можа дапамагчы мабілізаваць іх адну супраць другой. Акрамя таго, b) урад Лукашэнкі чулліва рэагуе на зрухі ў настроях грамадства, паколькі галоўныя тэндэнцыі нельга ігнараваць як "усяго толькі апазіцыю", да таго ж, c) насельніцтва навучыў не давяраць дзяржаўнай бюракратыі сам Лукашэнка, які рэгулярна адпраўляе ў адстаўку сваіх былых калег і па-ранейшаму пазіцыянуе сябе як барацьбіта супраць карупцыі.

Таму апазіцыя павінна значна павялічваць патэнцыял абароны ўласных правоў унутры краіны і залучаць шырокія масы насельніцтва да ўдзелу ў мясцовым змаганні і вырашэнні праблем. Групы па правах чалавека павінны ўмець не толькі праводзіць маніторынгі парушэнняў правоў чалавека і складаць адпаведныя справаздачы, але таксама стаць абаронцамі правоў чалавека.

Аднак, на жаль, да цяперашняга часу ЕС замест таго, каб сістэматычна ўмацоўваць праваабарончую працу ў Беларусі, у асноўным разлічваў на знешні ўплыў праз каналы замежнай дыпламатыі, што паказала сваю надзвычайную неэфектыўнасць у плане ўздзеяння на рэжым.

Праграма Еўрапейскага інструмента па справах дэмакратыі і правоў чалавека (EIDHR) на 2007-2013 гг. прадугледжвае наданне асаблівай увагі падтрымцы праваабаронцаў і павінна разглядацца як першы крок у правільным напрамку. Аднак узровень падтрымкі, які запланаваны для Беларусі да цяперашняга часу, з'яўляецца зусім неэфектыўным, асабліва ў параўнанні з узроўнем падтрымкі, аказаным у мінулыя гады, напрыклад, на студэнцкія праграмы.

## Развіццё партнёрства паміж ахвяравальнікамі і прадстаўнікамі апазіцыі

Беларускай апазіцыі патрэбная падтрымка, яе нельга пакідаць сам-насам з дзяржаўным апаратам, але неабходна звесці да мінімуму праявы залежнасці апазіцыйных груп і партый ад замежнай дапамогі. Аднак гэта не азначае, што ўзровень падтрымкі мае быць скарочаны. Наадварот: падчас падтрымкі апазіцыі павінна ўмацоўвацца і яе незалежнасць. Такім чынам, ахвяравальнікі з ЕС ды іх пасярэднікі мусяць абмежаваць ступень свайго ўмяшання і пазбягаць непасрэднага ўдзелу ў справах палітычных рашэнняў і стратэгій. Людзі звонку,

асабліва прадстаўнікі буйных фінансаваных дзяржавай праграм, павінны абмяжоўвацца спрыяннем дэмакратычным працэсам і не павінны ператварацца ў "непасрэдных удзельнікаў" унутранага дэмакратычнага працэсу.

Падтрымка Еўрапейскага Саюза ў дачыненні да апазіцыйных груп мусіць быць максімальна празрыстай, але пры гэтым не ставіць пад пагрозу мясцовых партнёраў, якія часта вымушаны абараняцца ад пераследу з боку беларускіх спецслужбаў ды іншых прадстаўнікоў "праваахоўных органаў".

ЕС павінен адкрыта ўзмацняць меры супраць махлярства і няправільнага распараджэння палітычнай дапамогай. І не таму, што гэта шырока распаўсюджана, а таму, што апазіцыю пастаянна гэтым папракаюць. Наяўныя ўнутры краіны рэсурсы для маніторынгу праектаў павінны быць пашыраныя дзеля таго, каб выяўляць парушэнні яшчэ на ранняй стадыі, да таго, як яны нанясуць шкоду грамадству. Пры гэтым экспертызе вынікаў трэба надаваць большае значэнне, чым раней, нават улічваючы тое, што палітычныя рызыкі ў Беларусі велізарныя.

## Як прывесці апазіцыю, грамадства і ўрад да стала перамоваў

Як ужо згадвалася раней, перамовы з урадам павінны быць арганізаваныя з удзелам апазіцыі, грамадзянскай супольнасці і, калі магчыма, прадпрымальнікаў і чыноўнікаў сярэдняга звяна. Такім чынам, туры перамоваў патрабуюць не толькі ўдзелу замежных дэлегацый, але таксама і прыцягнення грамадства. Калі пры арганізацыі грамадскіх круглых сталоў, творчых конкурсаў, канферэнцый, адкрытых культурных мерапрыемстваў афіцыйны акцэнт будзе рабіцца на ўдзеле грамадства, то апазіцыя "у натуральным парадку рэчаў" таксама павінна быць прыцягнутая і дапушчаная да ўдзелу.

Адмоўныя вынікі выбараў не мяняюць агульнай важнасці ўдзелу і дэманстрацыі прысутнасці дэмакратычнай апазіцыі па ўсёй краіне. Пасля таго, як парламенцкія выбары скончыліся агульным правалам кандыдатаў ад дэмакратычнай апазіцыі, наступнай стратэгічнай задачай з'яўляецца падрыхтоўка да новых мясцовых і прэзідэнцкіх выбараў, правядзенне якіх запланаванае на 2011 год. Разам з тым, неабходна працягваць і замацоўваць адукацыйныя праграмы для беларускай моладзі. Паколькі маладзейшыя пакаленні заўсёды маюць больш адкрыты светапогляд, чым іх папярэднікі, дэмаграфія, безумоўна, спрыяе развіццю дэмакратыі.

## *Падтрымка грамадзянскай супольнасці*

Падтрымка з боку заходніх няўрадавых ды іншых арганізацый іграе ключавую ролю ў захаванні беларускай грамадзянскай супольнасці, нягледзячы на палітыку стрымлівання, якую праводзіць урад. Але каб не абмяжоўвацца падтрыманнем існуючых кантактаў і арганізацый, але таксама спрыяць развіццю беларускай грамадзянскай супольнасці, неабходна разгледзець магчымасць некаторых зменаў.

Перш за ўсё, **грантадаўчая палітыка Еўрапейскага Саюза павінна стаць больш гнуткай і стаць як мага менш бюракратызаванай**. На сённяшнім этапе абавязковыя адміністратыўныя працэдуры выходзяць далёка за межы магчымасцяў многіх беларускіх грамадзянскіх арганізацый, не кажучы ўжо пра доўгі перыяд паміж падачай заяўкі і ўласна атрыманнем гранта. Іншая праблема заключаецца ў тым, што ў шмат якіх выпадках няўрадавыя арганізацыі могуць падаваць заяўкі толькі на кампенсацыю сродкаў, якія яны ўжо выдаткавалі. Такая сістэма непрыдатная для нядаўна ўтвораных арганізацый і, у асаблівасці, для незарэгістраваных арганізацый.

Яшчэ адной праблемай, звязанай з вышэйзгаданым, з’яўляецца тое, што гранты Еўрапейскага Саюза паводле вызначэння могуць давацца толькі зарэгістраваным арганізацыям са статусам юрыдычнай асобы, а гэта якраз тое, чаго вельмі складана дасягнуць у Беларусі. Новыя правілы Еўрапейскага Саюза, згодна з якімі **арганізацыі, зарэгістраваныя па-за межамі Беларусі, маюць права на атрыманне грантаў**, з’яўляюцца добрым прыкладам больш эфектыўнага і гнуткага падыходу, але і гэтага ўсё ж недастаткова.

Акрамя падтрымкі “традыцыйных” апазіцыйных арганізацый трэба надаваць больш увагі і **нефармальным суполкам найніжэйшага ўзроўню**. У шмат якіх выпадках яны валодаюць рэальным патэнцыялам дзеяння (асабліва на мясцовым узроўні), маюць актыўных і адданых членаў і складаюцца з маладых, жвавых і крэатыўных людзей. Тое, што яны практычна не могуць атрымаць зарэгістраваны юрыдычны статус, не павінна пазбаўляць іх магчымасці атрымання матэрыяльнай падтрымкі ад ЕС.

Фінансаванне мусіць працягвацца, паколькі ў большасці выпадкаў еўрапейская падтрымка мае цыклічны характар: яна даецца ў перадвыбарчы і паслявыбарчы перыяд альбо ў выпадках значных негатыўных падзеяў. Наяўнасць устойлівай базы фінансавання з пастаянным паступленнем сродкаў была б вельмі дарэчнай. Найчасцей патрабуюцца доўгатэрміновыя праграмы з перспектывай на 3-5 год. Яны павінны рэгулярна ацэньвацца дзеля таго, каб паток сродкаў можна было неадкладна скараціць, калі стратэгія не прынясе поспеху (альбо павялічыць, калі з’явяцца спрыяльныя нагоды).

Яшчэ адной амаль што забытай **групай, якой не стае большай увагі і падтрымкі, з’яўляюцца прафсаюзы**. Дзеянне Агульнай сістэмы прэферэнцый было прыпыненае ў чэрвені 2007 г. ў сувязі з невыкананнем Беларуссю рэкамендацый Міжнароднай арганізацыі працы, якія тычыліся правоў прафсаюзаў. Такім чынам, прафсаюзы маюць за сабой моцную знешнюю падтрымку – канкрэтна кажучы, падтрымку Міжнароднай арганізацыі працы. Дасягненне лібералізацыі ўмоваў для дзейнасці прафсаюзаў разам з аднаўленнем дзеяння Агульнай сістэмы прэферэнцый могуць аказаць дадатковае ўздзеянне на суцэльны працэс дэмакратызацыі шляхам яго станоўчага распаўсюджвання на няўрадавую сферу.

Такім чынам, у доўгатэрміновай перспектыве неабходна выпрацаваць больш гнуткую палітыку падтрымкі грамадзянскай супольнасці. Пакуль такая палітыка не выпрацаваная, **патрабуецца ўзмацненне ролі пасярэднікаў дзеля падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасці**. Грашовыя сродкі ЕС неабходна даваць тым еўрапейскім арганізацыям (як нацыянальным, так і міжнародным), якія ўжо маюць значны досвед і наладжаную практыку працы з беларускім грамадзянскім сектарам. Такія пасярэдніцкія арганізацыі маглі б у гэтым выпадку больш эфектыўна забяспечыць дастаўку сродкаў ЕС праз уласныя больш гнуткія фінансавыя схемы. Безумоўна, неабходна таксама гарантаваць максімальную фінансавую адказнасць і падсправаздачнасць пасярэдніцкіх арганізацый. Досвед краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы здольны значна дапамагчы працэсу фінансавання.

Магчымасць фінансавай падтрымкі палітычным партыям таксама мае важнае значэнне. Хаця ў ахвяравальнікаў ёсць зразумелыя прычыны, каб не падтрымліваць палітычныя партыі, неабходна разумець, што дэмакратыі без эфектыўнай шматпартыйнай сістэмы не бывае, і, улічваючы цяперашнія акалічнасці, спрыянне стварэнню і развіццю палітычных партый з’яўляецца такой жа важнай справай, як і падтрымка грамадзянскай супольнасці. У гэтым выпадку асабліва важнай з’яўляецца сталасць фінансавання, хаця ў перадвыбарчыя перыяды ўсё ж патрабуецца і дадатковая фінансавая падтрымка.

На жаль, да сённяшняга моманту ўдзел Захаду ў пераўтварэннях сферы **адукацыі** Беларусі нельга назваць паспяховым. На сённяшні дзень улады сфармавалі сістэму ідэалагічнага кантролю сістэмы адукацыі. Студэнты і выкладчыкі знаходзяцца пад пастаянным ціскам і праследам. Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, якая не з’яўляецца ўдзельнікам Балонскага працэсу. Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, заснаваны ў Мінску ў 1992 годзе дзеля прасоўвання каштоўнасцяў заходняй цывілізацыі, абвінавацілі ў актыўным супрацоўніцтве з замежжам і жорстка закрылі ў 2004 годзе.

## *Забеспячэнне Беларусі нецэнзураванай інфармацыяй*

Адзін з фактараў дагэтуль існуючай папулярнасці кіравання Лукашэнкі – амаль **поўны кантроль дзяржавы над беларускімі СМІ**. Усе тэлевізійныя каналы і радыёперадачы знаходзяцца пад дзяржаўным кантролем, пры тым, што была закрытая большасць незалежных часопісаў альбо падвяргаліся пераследу і арыштам журналісты, якія з імі супрацоўнічалі. Досыць цікава, што, дзякуючы наяўнасці расійскіх каналаў і вялікай колькасці спадарожнікавых прыёмнікаў у дамах грамадзян, інфармацыя пра свет даступная са шматлікіх крыніц. **Адсутнічае якраз інфармацыя датычна Беларусі** – у гэтай сферы ўрад ажыццяўляе поўны кантроль.

Нядаўна ўхвалены прэзідэнцкі законапраект ад 24 чэрвеня 2008 г. адкідвае беларускія СМІ назад у савецкія часы, змагаючыся супраць інтэрнэт-журналістыкі ў Беларусі і забараняючы беларускім СМІ прымаць фінансаванне з-за мяжы. У выніку абавязковай рэгістрацыі ўсіх беларускіх інтэрнэт-сайтаў і магчымасці пераследу журналістаў за “дыскрэдытацыю Беларусі” у значнай ступені павялічыцца інфармацыйны голад у Беларусі ў сувязі з нястачай крыніц масавай інфармацыі ўнутры краіны.

Менавіта таму вельмі важна пераадолець інфармацыйную манаполію рэжыму і забяспечыць беларусаў незалежнай інфармацыяй без цэнзуры. Гэта было б найбольш эфектыўным спосабам падтрымаць праеўрапейскі складнік самасвядомасці беларусаў і наблізіць іх да Еўропы.

Каб прадставіць альтэрнатыву манапалізаваным дзяржавай інфармацыйным службам, рабіліся шматлікія спробы запуску незалежных каналаў. Аднак неабходна **палепшыць каардынацыю паміж заходнімі альтэрнатыўнымі каналамі СМІ**. Сёння некаторыя з іх хутчэй канкурыруюць, чым супрацоўнічаюць, асабліва гэта тычыцца часу выпуску перадач, размеркавання частот і г. д. Больш за тое, яны спаборнічаюць за адны і тыя ж рэсурсы фінансавання нацыянальнага ўзроўню і ўзроўню ЕС, што таксама перашкаджае эфектыўнай дзейнасці. Яшчэ адна сфера, дзе неабходныя паляпшэнні – **гэта дыяпазон іх трансляцыі ўнутры краіны**, каб вяшчанне магло ахапіць як мага болей людзей.

Апрача лепшай каардынацыі заходніх альтэрнатыўных **медыя-каналаў, неабходна зрабіць большы акцэнт на падтрымцы электронных і інтэрнэт-СМІ**. У Беларусі ўзровень доступу да Інтэрнэту надзіва высокі і дынамічна расце: на сённяшні дзень ён знаходзіцца на адным узроўні з паказчыкамі Аўстрыі. Досвед паказвае, што Інтэрнэт – гэта не толькі спосаб перадачы інфармацыі, але і сродак мабілізацыі і актывізацыі.

Усталяванне добра наладжанай сеткі заходніх альтэрнатыўных каналаў СМІ было б самым эфектыўным сродкам **пераканаць звычайных беларусаў**

**у доўгатэрміновым станоўчым выніку пераходу да дэмакратыі**. Неабходна прадставіць лепшую верагодную альтэрнатыву тым бясспрэчна існуючым і лёгка прадказальным кароткачасовым перашкодам, на якія афіцыйны бок звычайна робіць акцэнт пры распаўсюджванні інфармацыі, каб падтрымаць агульную апатыю і скептыцызм людзей.

Хоць каардынацыя заходніх СМІ здаецца найбольш пільнай задачай, нельга ігнараваць той факт, што ў краіне ўсё яшчэ існуюць незалежныя друкаваныя і інтэрнэт-СМІ, якія неабходна падтрымаць і абараніць. Апроч гэтага, трэба забяспечваць дзяржаўныя СМІ праграмамі, якія б заахвочвалі журналістаў да прафесійнага росту і абменаў, а таксама да больш збалансаванага асвятлення ЕС і дэмакратычных працэсаў у іншых краінах.

## *Паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека*

Згодна з дакладам Адмысловага дакладчыка ААН па правах чалавека ў Беларусі, сітуацыя значна пагоршылася ў выніку падаўлення плюралізму ва ўсіх сектарах грамадства, адмаўлення грамадзянскіх правоў і ўціску палітычных свабод.

Неабходна растлумачыць рэжыму Лукашэнкі, што **паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі з'яўляецца перадумовай** для атрымання любых значных выгад ад ЕС. Аднак ад ЕС замест **суцэльных абяцанняў агульных "выгад", неабходныя больш канкрэтныя абяцанні**.

Перш за ўсё, нягледзячы на тое, што рэжым вызваліў усіх палітвязняў, належыць запатрабаваць **неадкладнага завяршэння палітычна матываваных судовых працэсаў**. Апрача таго, урад Беларусі павінен **спыніць усе самавольныя зняволенні**, уключаючы звязаныя з менш гучнымі справамі ў малых гарадах, галоўным чынам супраць апазіцыйных актывістаў ніжэйшага ўзроўню.

Калі б у Беларусі быў уведзены **мараторый на смяротнае пакаранне**, знялася б важная перашкода на шляху Беларусі да **ўваходжання ў Савет Еўропы**, бо на сённяшні дзень Беларусь – адзіная еўрапейская краіна, якая не з'яўляецца членам гэтай арганізацыі. Аднак трэба ўлічваць, што членства ў Савеце Еўропы магчымае пры выкананні шмат якіх іншых патрабаванняў апроч адмены смяротнага пакарання – такім чынам, не варта даваць безадказных абяцанняў пра лёгкае уступленне Беларусі ў гэтую арганізацыю.

Акрамя гэтага неабходна патрабаваць **неадкладна спыніць пераследаванне апазіцыйных рухаў і асоб**. Рэжым павінен зразумець, што дзеянні супраць апазіцыйных актывістаў нават ніжэйшага ўзроўню у абласцях не застануцца незаўважанымі, і што такія крокі могуць прывесці да сур'ёзнай адтэрміноўкі

любой падтрымкі з боку ЕС. Каб дасягнуць гэтага, ЕС павінен прыкладаць больш намаганняў і забяспечваць як мага шырэйшае інфармаванне пра гэтыя выпадкі, напрыклад праз пасольствы ў Беларусі. Забеспячэнне інфармавання часам можа быць больш эфектыўным за арыентаваныя на вузкія колы палітычныя патрабаванні, выказаныя на высокім узроўні. Гэта таксама надало б паслядоўнасці палітыцы ЕС у дачыненні да Беларусі.

Шанаванне правоў чалавека ў Еўропе сёння азначае **шанаванне нацыянальных меншасцяў і іх права на самаарганізацыю і ўдзел у грамадскім жыцці**. Еўрапейскія стандарты па нацыянальных меншасцях, якія грунтуюцца на Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах (Артыкул 27), дэкларацыі ААН па правах асоб, якія належаць да нацыянальных або этнічных, рэлігійных і моўных меншасцяў, двух пагадненнях Савета Еўропы (Рамачная канвенцыя па абароне нацыянальных меншасцяў і Еўрапейская Хартыя рэгіянальных моў або моў меншасцяў) і Дакуменце Капенгагенскай нарады АБСЕ 1990 г., павінны выконвацца і ажыццяўляцца на практыцы. Апошнія гады **засведчылі шматлікія прыклады розных рэпрэсій адносна арганізацый нацыянальных меншасцяў**, уключаючы намаганні паўплываць на вынікі выбараў, структуру і прадстаўленасць арганізацый нацыянальных меншасцяў. **Гэта застаецца важным фактарам падзелу ў адносінах з некаторымі суседзямі Беларусі, якія з'яўляюцца членамі ЕС.** Такім чынам, беларускі ўрад павінен спыніць свае намаганні па ўмяшанні ў дзейнасць незалежных арганізацый нацыянальных меншасцяў; насамрэч у гэтым плане роляй дзяржаўнага кіраўніцтва – у Беларусі – павінна быць падтрымка меншасцяў ва ўмацаванні іх правоў, што вынікаюць з вышэйзгаданых юрыдычных актаў ды іншых еўрапейскіх стандартаў і правілаў. **Прагрэс па гэтых пытаннях павінен уважліва адсочвацца інстытутамі ЕС**, бо шанаванне правоў меншасцяў застаецца адным з галоўных прынцыпаў інтэграванай Еўропы.

Як было згадана вышэй, асаблівую ўвагу трэба надаць фармаванню патэнцыялу беларускіх праваабаронцаў.

## *Шырэйшае эканамічнае супрацоўніцтва*

Вядома, што ўрад Лукашэнкі сутыкаецца з сур'ёзнымі эканамічнымі цяжкасцямі, галоўным чынам праз павышэнне Расіяй коштаў на энерганосьбіты і звязаныя з гэтым наступствы. Каб ураўнаважыць гэтыя адмоўныя фактары, Беларусь імкнецца паступова здымаць эканамічныя бар'еры ў адносінах з Захадам, хаця так і не праводзіць нейкіх значных палітычных рэформаў.

Беларусь мае падставы для аптымізму ў сувязі з гэтымі намаганнямі, бо **ў краіне ўжо прысутнічае значная колькасць еўрапейскіх кампаній**, што ў асноўным ігнаруецца як палітычнымі, так і навуковымі коламі Захаду. Аднак іх прысутнасць у Беларусі ўжо сведчыць пра пэўную тэндэнцыю да лакалізацыі, бо яны хочуць, каб іх інтарэсы прадстаўляліся і абараняліся. Урад адказвае на гэтыя запатрабаванні, што было добра прадэманстравана нядаўняй адменай “права залатой акцыі” – закону, які дазваляў дзяржаве пераймаць кіраванне любымі кампаніямі, у якіх дзяржаве належыць хаця б мінімальная доля. Таксама трэба спрыяць узмацненню аховы прыватных інвестыцый, якая выражаецца ў форме ўнутранага заканадаўства і міжнародных пагадненняў.

Нават у гэтых умовах даследчыкі мусяць вывучаць і аналізаваць наяўную ўцягнутасць еўрапейскага бізнесу у Беларусь, каб лепш зразумець і ацаніць, якія ёсць шанцы ў намаганняў Лукашэнкі па дасягненні эканамічнай адкрытасці. Захад таксама можа **абапірацца на прысутнасць еўрапейскага бізнесу ў Беларусі як на магчымы рухавік далейшых зменаў**.

Таму **варта заахвочваць далейшую ўцягнутасць еўрапейскага бізнесу ў Беларусь**. У дадатак да вышэйзгаданых матываў, гэтаму ёсць яшчэ адна важная прычына. А менавіта: ураду Лукашэнкі крайне патрабуецца замежны капітал, і таму альтэрнатывай атрыманню яго ад Еўропы з’яўляецца прыцягненне далейшых расійскіх (ці, магчыма, кітайскіх) інвестараў.

Таксама ёсць шэраг праграм па міжнародным супрацоўніцтве, якія ўжо спрыяюць эканамічным сувязям з Захадам, галоўным чынам з краінамі Балтыі ды Польшчай. Гэтыя праграмы садзейнічаюць сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёну тым, што падтрымліваюць малыя прадпрыемствы, паляпшаюць транспартную інфраструктуру і ахоўваюць агульную культурную і экалагічную спадчыну. Многія з праграм распрацаваныя для паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, напрыклад, праграмы ААН па барацьбе з незаконным абарачэннем наркотыкаў і гандлем людзьмі.

У цэлым мы павінны зразумець, што для Еўропы вельмі важна прадухіліць эканамічны крах у Беларусі. Абарона існуючых інтарэсаў еўрапейскага бізнесу – толькі частка праблемы. Такую ж важнасць мае і павелічэнне расійскага эканамічнага ўплыву, што не спрыяе эканамічным рэформам, вельмі важным для забеспячэння ўмоў для пераходу да дэмакратыі і эканамічнага супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларуссю. **Такім чынам, дапамога ў захаванні эканамічнай стабільнасці Беларусі з’яўляецца ключавым інтарэсам Еўропы.** Каб дасягнуць гэтага стану, неабходна ажыццявіць значныя эканамічныя рэформы – мэтанакіраванасць ЕС у гэтай справе стане важнай матывацыяй для ўлад.

Асноўныя праблемныя зоны, дзе патрабуюцца рэформы, моцна звязаныя і з дзяржавай, і з эканамічным сектарам, напрыклад, барацьба з карупцыяй,

зніжэнне выдаткаў на вядзенне бізнесу і ўзмацненне абароны інвестара – усё гэта садзейнічала б паляпшэнню эканамічнага клімату. Аднак самым важным пунктам застаецца высокі аб'ём знешняй пазыкі, які можа прывесці краіну да хістанняў на фінансавых рынках і эканамічнага краху.

## *Разумная візавая палітыка*

Бюракратычныя цяжкасці і выдаткі, звязаныя з атрыманнем віз у ЕС, даўно турбуюць беларусаў. Увядзенне сістэмы шэнгенскіх віз ва ўсіх трох краінах, што суседнічаюць з Беларуссю на Захадзе – Латвіі, Літве і Польшчы – пагоршыла сітуацыю. **Кошт 60 еўра за аднаразовую візу роўны прыблізна адной трэці сярэднемесячнага заробку ў Беларусі.** Апроч таго, сам працэс атрымання візы стаў больш складаным і марудным.

Больш за тое, увядзенне шэнгенскай сістэмы амаль адразу спарадзіла "чорны рынак" гандлю шэнгенскімі візамі і **ўсё больш людзей пачало звяртацца да груповак арганізаванай злачыннасці**, каб "пераправіцца" ў ЕС.

Еўрапейскі Саюз павінен разгледзець магчымасць распрацоўкі **новай, разумнай** – больш гнуткай і арыентаванай на попыт – **візавай палітыкі для Беларусі**, якая дазволіла б звычайным беларускім грамадзянам працаваць, вучыцца і падарожнічаць па Еўрапейскім Саюзе, палепшыла б агульны вобраз ЕС у Беларусі і дапамагла б прадухіліць аддаленне беларусаў ад Еўропы. Тым часам, дзякуючы сваёй гнуткасці, разумная візавая палітыка можа заставацца эфектыўным палітычным інструментам уздзеяння на членаў урада.

Разумная візавая палітыка павінна ўтрымліваць наступныя элементы:

- У цэлым **плата за візу для беларусаў павінна быць зменшаная**. У доўгатэрміновай перспектыве можна нават прапанаваць **пагадненне паміж ЕС і Беларуссю аб спрашчэнні візавага рэжыму** пры ўмове, што беларускі ўрад выканае пэўныя патрабаванні, вызначаныя ЕС. Да той пары, аднабаковыя крокі ЕС таксама могуць прывесці да дасягнення важных вынікаў.
- **Патрабуецца больш паслабленняў**. Разумным крытэрыем выбару магла бы быць мэта паездкі: для студэнтаў, навуковых дэлегацый і праграм па абмене неабходна ўвесці паніжаную плату за візу. У пэўных дастаткова абгрунтаваных выпадках можна нават разгледзець магчымасць выдачы бясплатнай візы. Іншы варыянт – ўвесці спрошчанае атрыманне візы ў залежнасці ад узросту заяўніка, напрыклад, для людзей, маладзейшых за 25 і старэйшых за 60 год плата за візу можа быць зменшаная.

- Трэба **часцей выкарыстоўваць сістэму гэтак званай “нацыянальнай візы”**, асабліва ў тых выпадках, калі заяўніку неабходна рэгулярна і на адносна доўгі перыяд наведваць дадзеную краіну.

Прыклад пагадненняў аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі з краінамі Заходніх Балкан, у межах якіх плата за візу была зніжана да 35 еўра, некаторыя групы заяўнікаў атрымалі бясплатную візу, а працэдуры па атрыманні візы былі спрошчаныя – гэты прыклад паказвае, якую выгаду атрымалі тыя ж сербы ад падобнай сітуацыі.

Каб зменшыць час, неабходны для атрымання шэнгенскай візы, краіны-члены ЕС павінны разгледзець магчымасць **павелічэння колькасці консульскага персаналу**, г. зн. прыцягненне мясцовай працоўнай сілы да консульскай працы ў свае пасольствы і консульствы на кантрактнай аснове. Такі крок не шкодзіць бяспецы шэнгенскай сістэмы і вядзе да паскарэння працэдур.

## *Трансатлантычнае супрацоўніцтва*

Дзякуючы больш аб’яднаным структурам распрацоўкі палітычнага курсу, **Злучаныя Штаты могуць эфектыўней за Еўрапейскі Саюз прымяняць санкцыі** і розныя **штрафныя меры**. Нядаўнія крокі Вашынгтона па ўвядзенні санкцый у дачыненні да ўсіх беларускіх нафтавых кампаній і гнуткая рэакцыя на пазітыўныя змены і адпаведнае паслабленне санкцый добра ілюструе патэнцыял дзеянняў. **Вызваленне палітычных вязняў дэманструе, што санкцыі, калі яны разумна дастасоўваюцца, могуць прынесці сур’ёзныя вынікі.**

Як ужо было адзначана, сучасная макраэканамічная сітуацыя Беларусі не дазваляе адміністрацыі Лукашэнкі далей псаваць адносіны *адначасова* з ЗША і ЕС. Паляпшэнне эканамічных сувязяў з Захадам з’яўляецца неабходнасцю для ўрада, а даходы ад знешняга гандлю павінны павялічвацца. Прымаючы пад увагу гэтае жаданне ўрада і нядаўнія захады ЗША, ЕС змог удасканаліць свой перамоўны патэнцыял тым, што **зрабіў акцэнт на ўласнай гнуткасці, гатоўнасці да перамоваў і больш пазітыўным падыходзе да Беларусі**, адэкватна дапаўняючы санкцыі ЗША, а таксама ўраўнаважваючы ўплыў Расіі.

Відавочна, што такая палітыка павінна праводзіцца скаардынавана, г. зн. не *насуперак* намерам Вашынгтона, а *ва ўзаемадзеянні*, маючы на ўвазе аднолькавыя задачы і ўжываючы розныя, але **дапаўняльныя** метады. Напрыклад, далейшыя санкцыі з боку Вашынгтона могуць быць дапоўненыя прапановамі па далейшым супрацоўніцтве з боку ЕС – выказанымі разам з дадатковымі патрабаваннямі. Беларусь не дастаткова моцная, каб і далей адмаўляцца ці супрацьстаяць

абедзвюм прапановам, бо трэці полюс – Расія – не прадстаўляе жыццяздольнай альтэрнатывы да таго часу, пакуль адміністрацыя Лукашэнкі імкнецца паменшыць сваю залежнасць ад Масквы. У такім выпадку Беларусь хутчэй адгукнецца на еўрапейскую прапанову – і, спадзяёмся, выканае патрабаванні, ў якіх зацікаўленыя і ЕС, і ЗША.

Стратэгічныя мэты, да якіх імкнуцца ЗША і ЕС, а менавіта, каб Беларусь была стабільнай і дэмакратычнай, супадаюць, і больш скаардынаваны трансатлантычны падыход можа тым больш стаць карысным для іх дасягнення.

# РЭКАМЕНДАЦЫІ

## *Дыялог з Мінскам з выкарыстаннем паступовага і абумоўленага падыходу*

Наладжванне кантактаў з рэжымам неабходнае для дасягнення зменаў у Беларусі. Эфектыўнасць перамоваў можа быць павышаная за кошт прыцягнення Украіны ў якасці пасярэдніка. Прынцып абумоўленасці павінен выконвацца на ўсіх этапах перамоўнага працэсу з выкарыстаннем пэўных механізмаў, такіх як гнуткі спіс неўязных асоб.

## *Прызначэнне Адмысловага прадстаўніка ЕС па справах Беларусі*

Еўрапейскі Саюз павінен удзяляць больш увагі Беларусі і пастаянна трымаць яе ў сваім палітычным парадку дня. Прызначэнне Адмысловага прадстаўніка ЕС па справах Беларусі стала б вельмі важным крокам. Гэта не толькі паслужыла б сігналам павышанай і бесперапыннай цікавасці Еўрапейскага Саюза да Беларусі, але таксама стварыла б сталы канал для дыялогу паміж апазіцыяй і урадам. Адмысловы прадстаўнік Еўрапейскага Саюза па справах Беларусі таксама змог бы эфектыўней каардынаваць розныя ініцыятывы.

## *Падтрымка дэмакратычнай апазіцыі*

Каб пераадолець маргіналізацыю апазіцыі, трэба спрыяць наладжванню ёю стасункаў з шырэйшай грамадскасцю і актыўнейшаму залучэнню грамадства да апазіцыйнай барацьбы – і наадварот. Большая разнастайнасць ў часы між кампаніямі па выбарах у прэзідэнты і зніжэнне залежнасці ад міжнародных ахвяравальнікаў павінна дапамагчы апазіцыі сфармаваць шырэйшую палітычную базу.

## *Падтрымка грамадзянскай супольнасці*

У доўгатэрміновай перспектыве трэба прымяняць больш гнуткую палітыку падтрымкі грамадзянскай супольнасці, удасканальваць каардынацыю паміж ахвяравальнікамі, а роля дасведчаных пасярэднікаў нацыянальнага і міжнароднага ўзроўняў павінна быць ўзмоцненая. Прыстасоўванне досведу арганізацый Цэнтральнай і Усходняй Еўропы палегчыла б гэты працэс. Неабходна прыкласці скаардынаваныя намаганні краін-членаў ЕС і фондаў, каб падтрымаць дзейнасць Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, які на сённяшні дзень знаходзіцца ў Вільнюсе (Літва) – адзінага беларускага універсітэта, які дае свабодную адукацыю маладому пакаленню беларускіх студэнтаў.

## *Забеспячэнне Беларусі нецэнзураванай інфармацыяй*

Неабходна палепшыць каардынацыю сярод існуючых СМІ, а таксама іх дыяпазон вяшчання ў краіне. Павінна павялічыцца падтрымка электронных і інтэрнэт-СМІ.

## *Паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека*

Разам з патрабаваннямі паляпшэння агульнай сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, асабліва ў плане сітуацыі з апазіцыяй, важна таксама, каб падзеі ў Беларусі атрымлівалі шырэйшае асвятленне, і каб аказвалася падтрымка мясцовым праваабаронцам.

## *Заахвочванне эканамічнай уцягнутасці Захаду*

Разумеючы, што ў эканамічнай стабільнасці Беларусі зацікаўлены і ЕС, неабходна заахвочваць уцягнутасць еўрапейскага бізнесу ў Беларусь. Аналіз і даследаванне наяўных эканамічных сувязяў паміж Беларуссю і ЕС павінны паслужыць першым крокам да большай уцягнутасці ў будучыні.

## *Разумная візавая палітыка*

- Агульнае скарачэнне платы за візу, разгляд магчымасці пагаднення паміж Беларуссю і ЕС аб спрашчэнні візавага рэжыму.
- Дазвол на большую колькасць паслабленняў у дачыненні да візавых збораў.
- Часцейшае выкарыстанне гэтак званай "нацыянальнай візы".
- Павелічэнне колькасці консульскага персаналу.

## *Удасканаленне трансатлантычнага супрацоўніцтва*

Дапасаванне розных падыходаў ЗША і ЕС да Беларусі магло б паспрыяць эфектыўнейшаму дасягненню вынікаў. ЕС павінен усведамляць і граць на сваім асаблівым становішчы і магчымасцях, а гэта – паралельна з больш строгай палітыкай ЗША ў дачыненні да Беларусі – належным чынам паслужыла б дасягненню агульнай трансатлантычнай мэты.

# АЎТАРЫ

## *Старшыня Працоўнай групы па Беларусі*

Аляксандр Квасьнеўскі, былы Прэзідэнт Польшчы

## *Члены Працоўнай групы па Беларусі*

Надзя Арбатава, Расія, Расійская акадэмія навук
Эміль Канстанцінэску (Emil Constantinescu), Румынія, былы Прэзідэнт
Павал Дэмеш (Pavol Demes), Славакія, Нямецкі фонд Маршала ЗША
Іштван Дзярмаці (István Gyarmati), Венгрыя, Прэзідэнт і Генеральны дырэктар Міжнароднага цэнтра за дэмакратычныя пераўтварэнні (ICDT)
Мілан Кучан (Milan Kucan), Славенія, былы Прэзідэнт
Соня Ліхт (Sonja Licht), Сербія, былая Старшыня Працоўнай групы па будучыні СФРЮ
Янаш Мартоні (Janos Martonyi), Венгрыя, былы Міністр замежных спраў
Янэ Холан Матлары (Janne Haaland Matlary), Нарвегія, былы Дзяржсакратар па замежных справах
Маркус Мекель (Markus Meckel), Германія, былы Міністр замежных спраў (ГДР)
Надзежда Міхайлава (Nadezhda Mihaylova), Балгарыя, былы Міністр замежных спраў
Анатолій Міхайлаў, Беларусь, рэктар Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта
Марыянэ Міко (Marianne Mikko), Эстонія, член Еўрапейскага парламента
Януш Анышкевіч (Janusz Onyszkiewicz), Польшча, Віцэ-прэзідэнт камісіі па замежных справах Еўрапейскага парламента
Барыс Тарасюк, Украіна, былы Міністр замежных спраў
Антанас Валёніс (Antanas Valionis), Літва, былы Міністр замежных спраў

## *Іншыя аўтары*

Ірэнеуш Біль (Ireneusz Bil), Польшча, Дырэктар, Фонд “Foundation Amicus Europae”
Петэр Колаша (Peter Kolossa), Венгрыя, Дырэктар па праграмах і развіцці, ICDT
Б’ёрн Кунтэр (Björn Kunter), Германія, Федэрацыя сацыяльнай аховы
Андраш Рац (András Rácz), Венгрыя, Венгерскі інстытут міжнародных адносін

*З прычыны ўнутрыдзяржаўных палітычных абставін Беларусь была выключаная з розных еўрапейскіх інстытутаў і міжнародных арганізацый і ператварылася ў ізаляваную краіну і ледзь не ў краіну-ізгоя. Беларусь зрабілася краінай, якую забыла Еўропа, дзяржавай, выключанай з паўсюднага спрыяльнага працэсу супрацоўніцтва ва ўсё больш і больш квітнеючай і інтэграванай Еўропе.*

*Тым не менш, з нядаўняга часу з боку беларускага ўрада і ўрадаў заходніх краін усё часцей выказваецца жаданне супрацоўнічаць. Напрыканцы 2007 года ў мэтах спрыянню гэтаму працэсу была ўтвораная Працоўная група па Беларусі, якая мусіла правесці ўсебаковы аналіз сітуацыі ў краіне і выпрацаваць канкрэтныя, дэталёвыя рэкамендацыі. Гэты даклад утрымлівае кароткую зводку поглядаў членаў групы і праведзенага аналізу.*

*Міжнародны цэнтр за дэмакратычныя пераўтварэнні (ICDT) – гэта некамерцыйная арганізацыя, заснаваная ў Будапешце, якая збірае досвед былых дэмакратычных пераўтварэнняў і дзеліцца ім з тымі, хто вырашыў ісці гэтым шляхам. Замест таго, каб прасоўваць дэмакратыю ўвогуле, ICDT ставіць больш канкрэтныя і практычныя мэты, засяроджваючыся на дэмакратычных пераўтварэннях як на працэсе. Цэнтр імкнецца паказаць, як дзесяткі маладых дэмакратый зрабілі і працягваюць рабіць гэтыя пераўтварэнні, каб тыя, хто пачынае сваю няпросты шлях ад дыктатуры да дэмакратыі, маглі ў будучыні вучыцца на іх поспехах і няўдачах.*

ICDT
International Centre for Democratic Transition

International Centre for Democratic Transition (ICDT)
1022 Budapest, Árvácska utca 12
Тэлефон: +36 (1) 438 0820 • Факс: +36 (1) 438 0821
Эл. пошта: info@icdt.hu • Вэб-сайт: http://www.icdt.hu